На прынцыпах беражлівых адносін да гістарычнай і культурнай памяці нашага народа

У другую нядзелю кастрычніка адзначаецца Дзень работнікаў культуры. Прафесійнае свята сустракаюць захавальнікі нацыянальнага духоўнага багацця. У чым сёння іх місія і якіх прынцыпаў прытрымлівацца творцам? З нагоды адметнай даты пагартаем старонкі "Культуры" – прыгадаем, на што сёлета акцэнтаваў нашу ўвагу Прэзідэнт.

"Вы ведаеце, якое паважлівае і ўважлівае маё стаўленне да нашай культурнай спадчыны. Гэта аснова асноў. Гэта наша душа. Без яе няма гісторыі, няма дзяржаўнасці і нас таксама няма – няма народа".

"Нашы ўяўленні пра сапраўдныя каштоўнасці, наша разуменне справядлівага ўкладу жыцця – усё фарміравалася там, у глыбіні стагоддзяў. Мы – нацыя са старажытнай гісторыяй. І дзяржаўнасць сваю будуем на прынцыпах беражлівых адносін да гістарычнай і культурнай памяці нашага народа. Усё, што стваралася на роднай зямлі сотні гадоў таму, усё, што мы сёння імкнёмся захаваць: старадаўнія абрады, рамёствы, святы – гэта і ёсць нашы карані".

Рэспубліканскае свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў"). 5–6 ліпеня.

"Мы жывём у век глабальных перамен. Магчыма, самых вялікіх за ўсю гісторыю чалавецтва. Якім будзе свет заўтра, мы сказаць не можам. І гэта самая вялікая праблема. Але дакладна ведаем, што ў гэтым віры абавязкова трэба захаваць свае самабытнасць, культуру, традыцыі".

"Гэта вы – таленавітыя людзі – знаходзіцеся ля вытокаў любой эканомікі і палітычных падзей. У гэтым сутнасць стварэння, шлях да справядлівай, бяспечнай будучыні для ўсіх нас".

"Славянскі базар у Віцебску". 10–13 ліпеня.

"У Беларусі мы актыўна пашыраем у грамадстве разуменне таго, што памяць аб Вялікай Перамозе – гэта частка нацыянальнай ідэі. Мы стараемся рабіць усё, каб нашы дзеці памяталі, што гэтай Перамогай мы моцна звязаны са сваімі ўсімі народамі, рускім народам, усімі народамі былога Савецкага Саюза".

"Як толькі забудзем дарогу да Хатыні, Сталінграда, Брэсцкай крэпасці, усё вернецца зноў, імгненна, нават не заўважым. Таму мы павінны, зубамі ўчапіўшыся, трымацца за гэтую гістарычную памяць".

Міжнародны патрыятычны форум Саюзнай дзяржавы "Вялікая спадчына – агульная будучыня" ў Волгаградзе. 29 красавіка.

"Вялікая Перамога і захаванне памяці аб ёй – частка нашай нацыянальнай ідэі".

Цырымонія ўручэння дзяржаўных узнагарод заслужаным прадстаўнікам розных сфер. Палац Незалежнасці. 5 мая.

"Мы прадаўжаем гісторыю няскоранага народа. Памяць пра яго подзвіг – пытанне нацыянальнай годнасці, без чаго размовы пра незалежнасць, суверэнітэт, свабоду – проста словы".

"Мы не адмаўлялі і не перакрэслівалі нашу гісторыю. Паняцце «братэрскія народы» для нас не фігура маўлення. Гэта спадчына, якую мы беражом".

Урачысты сход з нагоды Дня Незалежнасці. 1 ліпеня.

"Трэба, вядома, карані свае не забываць, у нас добрае мінулае, у «Беларусьфільма». Але трэба прыстасоўвацца да сучаснасці".

Падчас наведвання Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм". 10 чэрвеня.

"Дарагія нашчадкі! Пачынаючы ўзвядзенне новага будынка Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі ў год 80-годдзя Вялікай Перамогі, мы завяшчаем вам свята захоўваць памяць аб нашых вытоках, пройдзеным шляху да дзяржаўнасці і вялікай цане свабоды. Мы ўпэўнены, музей будзе сапраўднай скарбніцай бязмежнага багацця беларускай зямлі".

"Мы ўсвядомілі, павага да гісторыі і дасягненняў мінулага робіць нас куды больш моцнымі, паспяховымі, усяляе веру ва ўласныя сілы".

"Будзьце, як і мы, адданымі Радзіме, шануйце нацыянальныя духоўна-культурныя каштоўнасці і традыцыі, памнажайце поспехі суайчыннікаў! Беражыце нашу Беларусь! Беражыце мір і народнае адзінства! Будзьце годныя сваіх папярэднікаў".

Капсула са зваротам Прэзідэнта да будучых пакаленняў, будаўнічая пляцоўка Нацыянальнага гістарычнага музея і парку Народнага адзінства. 12 красавіка.

"Беражыце Беларусь – іншай такой не будзе. І не трэба, таму што яна самая прыгожая, цудоўная. Гэта месца для жыцця нас і нашых дзяцей".

Вялікдзень у храме Пакрова Прасвятой Багародзіцы Свята-Пакроўскага жаночага манастыра ў Талачыне. 20 красавіка.

Падрабязней на партале president.gov.by

Паважаныя дзеячы культуры! Сардэчна віншую вас з прафесійным святам!

Вы — тыя, хто захоўвае і памнажае нашу спадчыну, заснаваную на непахісных каштоўнасцях міру, любові, дабра і міласэрнасці. Імі прасякнута шматвяковая гісторыя нашай краіны. Па глыбінным прызначэнні культура выхоўвае чалавека, фарміруе яго светапогляд, вядзе да пазнання велічы і прыгажосці навакольля.

Немагчыма пераацаніць штодзённую працу мастакоў, музыкантаў, рэжысёраў, акцёраў, бібліятэчных работнікаў і многіх іншых людзей творчых прафесій, якія нясуць сваё служэнне, укладваючы ў яго ўсю душу і сілы. Асабліва хочацца адзначыць тых, хто прысвяціў культуры жыццё, і пажадаць ім моцнага здароўя і поспехаў у перадачы досведу новым пакаленням.

У нашай гісторыі духоўнае і культурнае адраджэнне заўжды спадарожнічалі адно аднаму. Няхай жа вашы творчыя дасягненні спрыяюць маральнаму развіццю грамадства, захоўваюць традыцыйныя каштоўнасці і культурную самабытнасць беларускага народа, садзейнічаюць удасканаленню чалавечых душ.

ВЕНІЯМІН,
Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі

Паважаныя калегі! Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём работнікаў культуры!

Работнікі культуры — гэта захавальнікі культурнай спадчыны і традыцый нашага народа. У сваёй творчасці вы ўвасабляеце сапраўдныя духоўныя каштоўнасці, прыгажосць роднай зямлі і выключнасць беларускай ідэнтычнасці. Дзякуючы вашай штодзённай працы і прафесіяналізму айчынная культура развіваецца не толькі ў сталіцы, але і ў самых аддаленых кутках нашай Радзімы.

Шматграннасць вашага таленту і адданасць справе выклікаюць велізарную павагу. Ваш неацэнны ўклад прыкметны ў кожнай значнай падзеі, памятнай даце і культурным мерапрыемстве, якія адгукаюцца ў сэрцах мільёнаў нашых суграмадзян. Вы натхняеце розныя пакаленні разумець і шанаваць унікальнасць нацыянальнай самабытнасці.

У асаблівы год 80-годдзя Вялікай Перамогі варта падкрэсліць адметную ролю работнікаў культуры ў захаванні памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа праз музыку, кіно, тэатр і музейныя экспазіцыі. Гэтае выбітнае служэнне гістарычнай праўдзе ўмацоўвае патрыятызм і пачуццё яднання народа.

Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, невычэрпнай жыццёвай энергіі і натхнення! Няхай ваша праца прыносіць радасць і заслужанае прызнанне, а кожны дзень будзе напоўнены новымі дасягненнямі і яркімі падзеямі.

Руслан ЧАРНЕЦКІ,
міністр культуры Рэспублікі Беларусь



Дарагія сябры!

Прыміце самыя шчырыя і сардэчныя віншаванні з прафесійным святам — Днём работнікаў культуры!

Гэтая дата — добрая нагода выказаць падзяку ўсім, хто выбраў сваім пакліканнем служэнне Яго Вялікасці Мастацтву, прысвяціў жыццё захаванню і прымнажэнню нашых культурных традыцый, зберажэнню маральных скрэп і духоўных каштоўнасцей беларускага народа.

Ваша справа надзвычай важная для развіцця грамадства. І незалежна ад таго, працуеце вы ў бібліятэцы або ў музеі, у сельскім клубе або ў тэатры, вы з'яўляецеся носьбітамі культуры, спрыяеце захаванню гістарычнай памяці, умацаванню народнага адзінства, а ў цяперашніх умовах, без перабольшвання, — і ўмацаванню нашай дзяржаўнасці.

Мы ганарымся сваёй багатай спадчынай, выдатнымі творцамі, якія пакінулі яркія старонкі ў летапісе нацыянальнай і сусветнай культуры. І, натхнёныя гэтым пачуццём, працягнем рабіць усё, каб квітнела і прыгажэла наша Радзіма.

У святочны дзень хочацца падзякаваць кожнаму са шматтысячнай каманды рупліўцаў на ніве культуры, ветэранам галіны за адданасць прафесіі, апантаную працу, шчырую вернасць Беларусі. Зычым вам моцнага здароўя, новых творчых здабыткаў, ідэй і багата радасных падзей.

Калектыў рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва"

Паважаныя работнікі культуры! Прыміце шчырыя віншаванні з прафесійным святам!

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь вельмі важны дзень, які аб'ядноўвае прадстаўнікоў творчых прафесій — артыстаў, музыкантаў, мастакоў, кінематаграфістаў, рамеснікаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў музеяў і бібліятэк.

Беларуская культура — гэта адзінства народа, заснаванае на агульных традыцыях, мове, духоўных каштоўнасцях і працавітасці. Гэта фундамент, які фарміруе і падтрымлівае нашу самасвядомасць, добразычлівасць і міралюбнасць. Культура праяўляецца ў трываласці і здольнасці беларусаў захаваць нацыянальную самабытнасць праз стагоддзі, нягледзячы на знешнія трансфармацыі і выклікі.

Беларускі прафесійны саюз работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму садзейнічае забеспячэнню ўмоў для творчага развіцця асобы, падтрымцы моладзі, арганізацыі культурнага баўлення вольнага часу, а таксама прымае актыўны ўдзел у аздараўленні членаў прафсаюзнага руху.

У гэтае свята мы з радасцю ўшаноўваем усіх, хто прысвяціў сябе нялёгкай і высакароднай справе — захаванню і развіццю гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Выказваю асаблівую падзяку тым, хто вядзе актыўную творчую і культурна-асветніцкую дзейнасць. Няхай ваша праца заўсёды прыносіць радасць і святло людзям.

Няхай ініцыятыва, энергія і вернасць любімай прафесіі дапамагаюць вам увасабляць самыя смелыя ідэі і праекты! Здароўя, натхнення і творчых поспехаў!

Міхаіл ПАРТНЫ,
старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму



▲ Вольга ЧАМАДАНАВА, старшыня Беларускай партыі "Белая Русь"



Паважаныя работнікі і ветэраны сферы культуры!

Прыміце шчырыя віншаванні з прафесійным святам — Днём работнікаў культуры!

Культура — сімвал непарыўнай сувязі розных пакаленняў беларусаў, іх любові да Радзімы, яе багатага мінулага і сучаснасці.

Гэты дзень аб'ядноўвае ўсіх, хто сваім майстэрствам і талентам зберагае традыцыі, хто цалкам аддае сябе нялёгкай і высокай справе захавання і развіцця найбагацейшай спадчыны нашай краіны, хто памнажае ўнікальны культурна-гістарычны здабытак беларускай зямлі, веліч роднай мовы і літаратуры, агульначалавечыя каштоўнасці.

Вы дорыце людзям свята, робячы наша жыццё гарманічным і яркім! Ваш досвед спрыяе фарміраванню ў моладзі пачуцця нацыянальнай годнасці і гонару за Рэспубліку Беларусь.

Ад усёй душы жадаю міру, дабра, дастатку, любові, натхнення, невычэрпнай энергіі, творчага пошуку і новых дасягненняў!

Аляксандр ШЫПУЛА,
дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

▲ Аляксандр КОПЕЛЕЎ, старшыня Міжнацыянальнага дзелавога сходу Беларускага грамадскага аб'яднання "Русь", былы Царкоўна-грамадскага савета па культуры Беларускай праваслаўнай царквы, саветнік старшыні праўлення Беларускага саюза кінематаграфістаў

Вершаналіванне — учнёвае Тлумачэнне

Паважаныя калегі! Дарагія сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з Днём работнікаў культуры!

Наша прафесійнае свята – гэта добрая нагода выказаць шчырую ўдзячнасць усім, хто прысвяціў жыццё служэнню мастацтву, зберагае і памнажае вялікую культурную спадчыну нашага народа, выхоўвае пачуццё прыгожага, любоў і павагу да творчай працы.

Сёння бібліятэкі з'яўляюцца не толькі цэнтрамі збору і захоўвання рукапісаў і друкаваных выданняў. Гэта важныя адукацыйныя, навуковыя, культурныя і інфармацыйныя цэнтры.

У многім дзякуючы работнікам нашай галіны, іх падтрымцы і няўрымслівай працы, узаемадзеянню з прадстаўнікамі іншых кірункаў захоўваюцца і памнажаюцца нацыянальныя каштоўнасці.

І ў гэты святочны дзень хочацца з асаблівай цеплынёй адзначыць плённую працу работнікаў усёй сферы культуры. Менавіта яны праслаўляюць нашу Бацькаўшчыну – праз музыку, мастацкія палотны, тэатральныя пастаноўкі, кіно, літаратуру і, зразумела, кніжныя скарбы.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, поспехаў, міру і стварэння!

Вадзім ГІПН,
генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі,
дэпутат Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Дзень работнікаў культуры – гэта прафесійнае свята, якое аб'ядноўвае людзей творчых прафесій, тых, хто захоўвае і папулярызуе культурную спадчыну нашай краіны. Сёння супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўносяць значны ўклад у справу выхавання патрыятызму і грамадзянскай адказнасці новага пакалення, зберагаюць памяць аб вялікім подзвігу народа.

У гэты дзень усім работнікам культуры выказваю шчырую ўдзячнасць за высакародную працу. Жадаю творчага натхнення, рэалізацыі яркіх праектаў. Захоўвайце і памнажайце нацыянальны здабытак краіны, які ўвабраў у сябе найлепшыя ўзоры матэрыяльнай і духоўнай спадчыны. Няхай ваша праца і надалей будзе надзейным шчытом памяці беларускага народа, а пачуццё выкананага абавязку саграваe вашы сэрцы!

Уладзімір ВАРАПАЕЎ,
дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея
гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Дарагія і паважаныя калегі!

Я хачу ад усяго сэрца павіншаваць вас з прафесійным святам – Днём работнікаў культуры!

Ваша вера ў сілу мастацтва, вашы цярпенне, талент і адданасць дапамагаюць свету стаць ярчэйшым, багацейшым і дабрэйшым. Вы – захавальнікі духоўных каштоўнасцей, праваднікі прыгажосці. Дзякуючы вашай нястомнай і руплівай працы мы ўсе можам дакрануцца да высокага, адчуць адзінства і гармонію праз музыку, тэатр, літаратуру, выяўленчае мастацтва і мноства іншых формаў культурнага выражэння. Вы дорыце людзям надзею, радасць, спакой і натхненне. Вы звязваеце пакаленні, зберагаеце нацыянальную культурную спадчыну.

У гэты адметны дзень я хачу пажадаць вам моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту і невычэрпнай творчай энергіі. Няхай вашы ідэі ўвасабляюцца ў яскравых праектах, а праца заўсёды выклікае шчыры водгук і прызнанне.

Зычу бясконцай любові да таго, што вы робіце, удзячных чытачоў, прыхільнікаў і гледачоў, якія цэняць і шануюць вашы здабыткі. Няхай у вашых сэрцах заўсёды жыве любоў! Вялікі дзякуй за цярпенне, стараннасць і запал!

Ад душы віншую з гэтым выдатным святам і жадаю, каб ваша творчасць заўжды прыносіла радасць вам і ўсім, хто побач!

Ірына ДАРАФЕЕВА,
заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь

Шаноўныя калегі!

Мы адзначаем важнае свята — Дзень работнікаў культуры. Гэта магчымасць яшчэ раз падзякаваць усім, хто пастаянна ўкладвае душу і прафесіяналізм у развіццё нашай агульнай прасторы — культуры, мастацтва, адукацыі і творчасці.

Культура — не проста прафесія, а прызванне, сіла, якая гуртуе людзей, дапамагае лепш разумець адзін аднаго і свет вакол. Наша праца — мост паміж традыцыямі і будучыняй, мінулым і сучаснасцю. Менавіта дзякуючы захопленасці, таленту і адказнасці ствараюцца новыя спектаклі, выставы, канцэрты, адукацыйныя праграмы і праекты, якія робяць жыццё больш яркім.

Цяпер, у неспакойным свеце, які хутка змяняецца, роля культуры і маральных каштоўнасцей асабліва вялікая. Гэта фундамент, на якім будуецца патрыятызм, павага да краіны і яе гісторыі, фарміруецца духоўна багатае і ўстойлівае грамадства. Мы, як творчая ВНУ, маем на мэце не толькі перадачу ведаў, але і выхаванне пачуцця адказнасці, любові да культуры, імкнення развіваць яе далей. Нашы таленавітыя студэнты — будучыня мастацтва, а таксама актыўныя грамадзяне, гатовыя зберагчы і прымножыць спадчыну.

Асобна хачу падзякаваць кіраўніцтву нашай дзяржавы, і ў прыватнасці Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку, за нязменную падтрымку сферы культуры, за ўвагу да яе развіцця і захавання. Дзякуючы гэтай падтрымцы ў нас ёсць усе магчымасці для рэалізацыі самых смелых творчых праектаў і адукацыйных ініцыятыў. Гэтая дапамога — значны стымул для кожнага з нас працаваць яшчэ лепш.

Ад імя ВНУ віншую ўсіх работнікаў галіны, хто з энтузіязмам і прафесіяналізмам рухае наперад нашу агульную справу. Разам мы працягваем ствараць прастору, дзе нараджаюцца ідэі.

Няхай у працы заўсёды будзе месца натхненню і задавальненню ад выніку, а падтрымка калег і падзяка гледачоў, слухачоў, наведвальнікаў служыць новай матывацыяй.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, творчых адкрыццяў, энергіі і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

Наталля КАРЧЭЎСКАЯ,
рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў





▲ Кацярына ДУЛАВА, генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі, уладальніца медаля Францыска Скарыны, доктар мастацтвазнаўства, прафесар

Прыміце шчырыя віншаванні з Днём работнікаў культуры! У календары прафесійных свят гэтая дата займае адно з самых годных месцаў, бо наша сфера аб'ядноўвае яркіх, творчых, ініцыятыўных, таленавітых і апантаных сваёй працай людзей.

Сярод інстытуцый галіны культуры немагчыма пераацаніць ролю музеяў, дзе захоўваецца і транслюецца гісторыя нашага грамадства. Прафесія музейнага работніка — адна з найбольш рэдкіх. Яна патрабуе шмат інтэлектуальных, духоўных, а нярэдка і фізічных намаганняў. Дзякуючы самаадданай працы гэтых спецыялістаў тысячы людзей могуць дакрануцца да ўнікальных узораў культуры і мастацтва, самабытнай народнай творчасці.

Сёння музей — актыўны ўдзельнік грамадскага, навуковага і культурнага жыцця краіны. Зберагаючы традыцыйныя падыходы, ён укараняе і інавацыйныя тэхналогіі. Гэты сінтэз адпавядае запытам сучасных наведвальнікаў, дазваляючы больш поўна і дакладна раскрыць пазіцыю музейнага экспаната як крыніцы інфармацыі.

Шаноўныя калегі! У гэты асаблівы дзень хочацца адзначыць не толькі прафесійныя дасягненні, але і чалавечнасць, цеплыню і клопат, якія вы ўкладваеце ў працу. Жадаю здароўя, шчасця і поспехаў. Няхай кожны праект прыносіць радасць і задавальненне, у вашых сэрцах заўсёды гарыць агонь натхнення, а вакол пануе атмасфера творчасці і гармоніі.

Са святам, дарагія работнікі культуры!

Аляксандр ХРАМЫ,
дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

Ад імя кіраўніцтва Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь сардэчна вітаю з Днём работнікаў культуры! Ваша прафесійная дзейнасць — найважнейшая частка духоўнага і культурнага развіцця грамадства. Дзякуючы вашай працы, нашым агульным намаганням захоўваецца і памнажаецца багатая спадчына, адбываецца эстэтычнае і маральнае выхаванне грамадзян.

Жадаю творчых поспехаў, натхнення, моцнага здароўя і прызнання. Няхай ваша дзейнасць прыносіць радасць і задавальненне, а энергія і ідэі спрыяюць далейшаму развіццю культурнай сферы.

Дзякуй за працу і адданасць справе!

Алена СЕКАЧ,
дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь



Паважаныя калегі, віншую з Днём работнікаў культуры!

Ваш унёсак у духоўнае развіццё грамадства немагчыма недаацаніць. Дзякуй, што беражліва захоўваеце тое, што так лёгка разбурыць і нельга ўзнавіць, — нашу багатую культурную спадчыну. У свеце, які ўвесь час змяняецца, вы стаіце на варце вечных каштоўнасцей: прыгажосці, памяці і духу беларускага народа.

Шчыра жадаю, каб высакародная місія, якую вы з такой самаадданасцю выконваеце, заўсёды мела прызнанне, прыносіла бясконцую радасць, працягвала натхняць, выхоўваць і дарыць надзею!

Асабліва прыемна ў гэты дзень падзякаваць тым, хто робіць уклад у развіццё беларускага кінематографа. Кіно — гэта магія, якая ствараецца намаганнямі многіх людзей і становіцца сапраўдным цудам тады, калі знаходзіць гледача. Кожны паказ, кожны фестываль, кожны артыкул ці проста добрае слова пра нашы фільмы — неацэнная падтрымка, якая дае сілы рухацца наперад.

Дык няхай наша сумеснае падарожжа будзе доўгім і захапляльным! Са святам!

Алена ТУРАВА,
рэжысёр Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм"

Калектыў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы сардэчна віншуе сяброў і калег з прафесійным святам — Днём работнікаў культуры!

Ваша адданая і шчырая праца зберагае і памнажае неацэнны скарб — духоўную спадчыну нашага народа, ашчадна захоўвае гістарычную памяць, далучае нас да культурных каштоўнасцей, здабытых чалавецтвам. Зычым вам плёну, творчага ўздыму, натхнення, радасці і шчасця!

Ганна ГАЛІНСКАЯ,
дырэктар
Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы



Са святам беларускай культуры!

Паважаныя калегі, дарагія сябры!

Ад усяго сэрца віншую вас з нашым прафесійным святам — Днём работнікаў культуры!

Беларускім музыкантам пашчасціла працаваць у прасторы выдатнай, выбудаванай сістэмы музычнай адукацыі, якая ўключае тры ступені: пачатковую, сярэднюю і вышэйшую. Такая сістэма, якая дасталася нам у спадчыну ад савецкага часу, была па-сапраўднаму прагрэсіўнай і, я ўпэўнены, застаецца найлепшай у свеце.

Менавіта фундаментальная адукацыя дорыць нашым артыстам істотную перавагу. І мы бачым бліскучыя вынікі: маладыя піяністы, студэнты і выпускнікі акадэміі, граюць на ўзроўні, які 40—50 гадоў таму ўяўляўся недасяжным. Яны неверагодна канкурэнтаздольныя, з трыумфам выступаюць на міжнародных конкурсах, становяцца лаўрэатамі. Іх энергія і адданасць мастацтву захапляюць: сёння яны сумяшчаюць выкладанне з актыўнай канцэртнай дзейнасцю, пастаянна рыхтуюцца да новых выступленняў.

Пра што гэта кажа? У нашай краіне не проста актыўнае музычна-выканальніцкае жыццё — яно кіпіць! Афіша Беларускай дзяржаўнай філармоніі стракаціць самымі рознымі мерапрыемствамі, а праца яе зал распісана на месяцы наперад.

У святочны дзень я жадаю ўсім нам высока несці сцяг беларускага мастацтва. У нас выдатная музычная школа і найбагацейшая спадчына, створаны сапраўдныя шэдэўры. Наша з вамі місія — папулярызаваць іх не толькі дома, але і далёка за межамі краіны, паказваючы свету, якія ўнікальныя ўзоры высокага мастацтва нараджаюцца ў Беларусі.

І, вядома, я ад усёй душы зычу кожнаму з нас частых і радасных сустрэч з чулай і ўдзячнай публікай на канцэртах, дзе гучыць вечнае, акадэмічнае мастацтва.

Са святам! Здароўя, натхнення і новых творчых здзяйсненняў!

Ігар АЛОЎНІКАЎ,
народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, кавалер ордэна Францыска Скарыны, прафесар

З Днём работнікаў культуры, дарагія сябры і калегі!

Эпохі і падзеі, змяняючы адна адну, знаходзяць увасабленне і працяг у творах мастацтва, літаратурных, музычных праектах і музейнай прасторы, натхняючы на новыя здзяйсненні.

Выявы выдатных асоб і простых служыцеляў муз непарыўна звязаны з асветніцтвам, фарміраваннем культурнага ўзроўню грамадства, выхаваннем у яго грамадзян маральнасці і любові да роднай краіны.

Нацыянальны культурны здабытак, створаны пакаленнямі мінулага і сучаснасці, заўсёды скіраваны ў будучыню. Спалучэнне традыцыйных і наватарскіх ідэй адкрывае новыя магчымасці ў прымнажэнні агульначалавечых каштоўнасцей і духоўнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь, напаўняючы сэрцы людзей павагай і гонарам за сваю Айчыну і яе гісторыю.

Няхай не вычарпаюцца ваш талент і творчы парыў, а вынікі працы знаходзяць водгук у прыхільнікаў культурнай спадчыны!

Няхай праца прыносіць шчасце і радасць ад дотыку да прыгожага, пашыраючы прастору для новых здзяйсненняў, дэманструючы талент і бязмежную любоў да сваёй справы.

Няхай лёс будзе да вас прыхільны, а натхненне — плённым і стваральным!

Аляксандр КАРКАТАДЗЭ,
дырэктар Мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой"



► Уладзімір ТОЎСЦІК
народны мастак Беларусі

Паважаныя калегі і сябры! У гэты святочны дзень выказваем шчырую падзяку ўсім, хто прысвяціў сябе культуры. Хай заўсёды спадарожнічаюць вам творчыя поспехі, натхненне і моцнае здароўе. Жадаем, каб, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, вы ўпэўнена крочылі гэтым цудоўным шляхам мастацтва.

Кожнаму, хто адданы сваёй справе, жадаем ніколі не страціць той самай іскрынкі ў вачах — сімвала шчасця, любові і прагі творчасці, што дапамагае здзяйсняць сапраўдныя цуды на сваіх працоўных месцах.

Зычым берагчы і памнажаць святло, бо толькі так можна даносіць у свет дабрыню і гармонію.

Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь "Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры»"

Душа народа, сэрца нацыянальнай самабытнасці, скарбніца шматвяковай мудрасці... Тысячы сэнсаў, вобразаў і місій заключана ў гэтым свяшчэнным слове — культура. Гэта магутная і нераможная сіла, што фарміруе нашыя погляды і маральныя компасы, нястомна нясе агонь вечных гуманістычных і эстэтычных ісцін, абуджае ў чалавеку тонкае пачуццё прыгожага.

Шчыры дзякуй вам, дарагія калегі, за вернасць і адданасць нашай высакароднай справе, за вашу нястомную працу — залог захавання і працвітання нацыянальнай спадчыны, за зберажанне святой сувязі паміж пакаленнямі!

Вялікі дзякуй за нязменную падтрымку хачу сказаць і ўсім прыхільнікам айчыннага кіно і спецыялістам сферы! Беларускі кінематограф сёлета зрабіў важны крок наперад. Сумеснымі намаганнямі мы адрадзілі фестываль беларускіх фільмаў, які стаў сапраўдным святам для нашай краіны. З фурорам прайшла 28-я "Анімаёўка", што сабрала рэкордную колькасць удзельнікаў з 78 краін свету. Мноства яркіх мастацкіх, дакументальных і анімацыйных прэм'ер з'явілася на шырокіх экранах краіны апошнім часам.

Упэўнены: наперадзе нас чакае яшчэ больш бліскучых пачынанняў і амбіцыйных праектаў! Жадаю моцнага здароўя і творчага натхнення, каб увасобіліся ў жыццё ўсе вашыя задумы!

Шчасця, кахання, удачы і дабрабыту! З Днём работнікаў культуры Рэспублікі Беларусь!

Яўген АРЭНДАРЭВІЧ,
старшыня праўлення Беларускага саюза кінематаграфістаў

Дарагія сябры і калегі, паважаныя работнікі культуры!

Прыміце самыя цёплыя віншаванні з прафесійным святам — Днём работнікаў культуры!

Сфера культуры аб'ядноўвае прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, сярод іх — музейныя спецыялісты, супрацоўнікі бібліятэк, музыканты, мастакі і артысты, якія вучаць шанаваць традыцыі і спадчыну мінулага, захоўваць і зберагаць гісторыю, бачыць і разумець прыгожае, выхоўваюць духоўнасць, чалавечнасць і міласэрнасць. Без культуры было б складана ўявіць развіццё грамадства.

Работнікі творчых прафесій — гэта захопленыя, таленавітыя і шчыра адданыя сваёй справе людзі. Галоўным у нашай працы з'яўляецца не колькасць напісаных сцэнарыяў або праведзеных экскурсій, сыграных спектакляў ці прачытаных кніг, а здольнасць выклікаць своеасаблівыя пачуцці і перажыванні, што злучаюць акцёра і гледача, экскурсавода і наведвальніка, бібліятэкара і чытача.

У гэты святочны дзень шчыра жадаю ўсім невычэрпнай энергіі, прафесійных перамог, творчага даўгалецця і яркіх падзей! Няхай кожны дзень прыносіць вам новыя ідэі і арыгінальныя праекты, а гармонія і прыгажосць робяць ваша жыццё заўсёды насычаным і цікавым!

Моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту вам і вашым блізкім!

Юрый КІТУРКА,
дырэктар Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея



Паважаныя работнікі культуры!

Ад усёй душы віншуем вас з прафесійным святам! Сёння асаблівы дзень, калі мы выказваем словы падзякі ўсім творцам, усім, хто робіць наш свет ярчэйшым, багацейшым і больш гарманічным.

Ваша прафесійная дзейнасць — гэта не толькі творчы працэс, але і важнае сацыяльнае значэнне. Вы натхняеце людзей вакол, пашыраеце іх кругагляд, захоўваеце і назапашваеце нацыянальныя традыцыі і культурную спадчыну. Дзякуючы вам ажываюць музеі, тэатры напаўняюцца гукамі, выставы радуюць вочы і душы. Вы — мост паміж мінулым і будучым.

Няхай кожны праект прыносіць вам радасць, а творчая плынь вядзе да новых вяршынь. Жадаем вам моцнага здароўя, натхнення і сіл для важных падзей і яркіх ідэй. Няхай ваша праца заўсёды будзе запатрабаваная і ацэненая па заслугах. Поспехаў!

Віншуем вас, шаноўныя калегі!

Калектыў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы

▶ Людміла ХІТРОВА, прыма-балерына Вялікага тэатра, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь

Дарагія калегі, шаноўныя дзеячы культуры!

Педагагічная дзейнасць заўсёды патрабуе вялікіх сіл, цярпення, адданасці і любові да людзей. У нашай сферы — у свеце мастацтва і харэаграфіі — мы працуем не толькі дзеля перадачы ведаў і навыкаў, але і дзеля таго, каб запаліць у сэрцах людзей, асабліва дзяцей і моладзі, любоў да мастацтва, да роднай зямлі, да прыгажосці і дабрыні. Кожная рэпетыцыя, кожнае выступленне — гэта маленькае свята душы, у якім жыве вера і натхненне. Культура дапамагае чалавеку адчуваць радасць жыцця, бачыць харства ў простым і імкнуцца да высокага.

У гэты важны дзень хачу звярнуцца да ўсіх, хто прысвяціў сваё жыццё служэнню культуры: тварыце, любіце і жывіце ў творчасці! Няхай у вашых сэрцах ніколі не згасае агонь натхнення, няхай ваш шлях будзе асветлены павагай і прызнаннем людзей. Пажадаю, каб у кожнага хапала сіл і мудрасці ісці далей, адкрываць новыя гарызонты і аддаваць свой талент дзеля прыгажосці і гармоніі ў свеце. Няхай кожны дзень будзе напоўнены музыкай, рухам, святлом і любоўю да сваёй справы!

Вадзім МАТАНЦАЎ,
кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танца "Сузор'е"

◄ Ганна МАТОРНАЯ
галоўны рэжысер Віцебскага тэатра
уладальніца медаля Францыска Скарыны



Дарагія калегі!
Шчыра віншую вас з прафесійным святам — Днём работнікаў культуры! Жадаю вам творчага натхнення, новых ідэй, поспехаў у рабоце і, вядома, моцнага здароўя!
Вера і Любоў — вашы анёлы-ахоўніцы!
З павагай, Ганна Маторная

▲ Дзмітрый ЦЫБУЛЬКА,
рэжысер Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", сцэнарыст і рэжысер фільма "Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь"

Паважаная калега!
Вашыну таленавітасць, самаадданую творчую працу, заваяванае і ўтрыманае сцэнічнае майстэрства ад усяго сэрца віншую з прафесійным святам!
Хай ваш уклад у развіццё культуры — каштоўнейшая багацце Беларусі, будзе плённай творчая праца, а яркія прыхільнікі радуюць і захапляюць!
Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця, поспехаў, дабрабыту!
З павагай, Сяргей Усік

▲ Сяргей УСІК,
дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры

Дарагія і любімыя калегі! Шчыра віншую ўсіх з прафесійным святам! З Днём работнікаў культуры! Дзякуй за натхненне, прыгажосць і захаванне нашых традыцый. Жадаю ўсім моцнага здароўя, нязгаснай энергіі, новых ідэй і вялікіх здзяйсненняў. Няхай вас заўсёды суправаджае творчы поспех, а публіка будзе ўдзячнай і шчырай!

Вольга БУЛАЙ,
артыстка Маладзёжнага тэатра эстрады

Дарагія сябры! Ад шчырага сэрца віншую ўсіх работнікаў культуры з прафесійным святам! Няхай кожны дзень дорыць вам шчасце, моцнае здароўе, творчы поспех і шчырую любоў. Няхай натхненне ніколі не пакідае вас, а прызнанне і падзяка навакольных стануць заслужанай узнагародай за ваш талент і адданасць справе. Са святам культуры, прыгажосці і душы!

Аляксандр САЛАДУХА,
заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь

Віцебск — горад, які валодае шматвяковымі гістарычнымі скрыжаваннямі, што фарміруюць нашу духоўную і культурную спадчыну. Віцебская зямля, што стала калыскай беларускай культуры і дзяржаўнасці, свята захоўвае памяць пра найважнейшыя падзеі ў гісторыі нашага народа, нашай краіны, працягваючы з году ў год на аснове гэтай памяці ствараць будучыню Беларусі.

Культура — аснова самабытнасці і крыніца духоўнасці нацыі. Яна ўвасабляе ўнікальныя традыцыі беларускага народа, фарміруе светапогляд чалавека, яго маральныя прынцыпы. Яе стваральная сіла аб'ядноўвае грамадства, нясе ў сабе вечныя ідэі гуманізму, прыгажосці, дапамагае развіваць эстэтычны густ, пашыраць кругагляд.

Дзякуючы намаганням работнікаў культуры, вашай адданасці прафесіі адбываецца захоўванне традыцый, забяспечваецца надзейная сувязь пакаленняў. Вы прывіваеце моладзі найлепшыя маральныя якасці і ідэалы, выхоўваеце любоў да прыгажосці, павагу да нашай багатай гісторыі, гонар за сваю радзіму.

У гэты важны для кожнага з нас дзень хочацца выказаць цёплыя словы падзякі ветэранам музейнай справы, тым, хто ўнёс неацэнны ўклад у станаўленне і развіццё культуры Віцебска і Віцебскай вобласці.

Музей — жывы арганізм, які пастаянна развіваецца. Штогод Віцебскі абласны краязнаўчы музей папаўняецца новымі людзьмі — маладымі спецыялістамі, якім трэба будзе пераняць эстафету захоўвання і прымнажэння культурных традыцый вобласці. Поспехаў вам, паважаныя калегі! Мы верым, што вы годна і з гонарам будзеце несці высокае званне работніка культуры.

Ад усяго сэрца жадаем міру, дабрабыту, любові, натхнення, невычэрпнай энергіі, творчага пошуку і новых дасягненняў! Са святам! З Днём работнікаў культуры!

Таццяна СТАРЫНСКАЯ,
дырэктар Віцебскага
абласнога краязнаўчага музея

Прыміце самыя сардэчныя віншаванні з нашым прафесійным святам — Днём работнікаў культуры!

Для нас асаблівы гонар і вялікая радасць звяртацца да вас са старонак рэспубліканскай газеты "Культура". Гэты год для Іванаўшчыны знакавы — наш горад удастоены высокага статусу "Культурная сталіца Беларусі — 2025". Гэта не толькі велізарная адказнасць, але і магчымасць, якае дазваляе нам ярка прадставіць увесь культурны патэнцыял рэгіёна, паказаць яго самабытнасць, турыстычныя магчымасці. Мы змаглі шырэй далучыць грамадскасць да творчых праектаў, актывізаваць ініцыятыву землякоў, прыцягнуць у раён і паказаць людзям вядучыя калектывы і выканаўцаў Беларусі.

З нагоды свята хачу выказаць шчырую падзяку ўсім, хто прысвяціў сябе служэнню культуры: дзеячам мастацтва, захавальнікам культурнай спадчыны, нашым дарагім гледачам і наведвальнікам бібліятэк. Асобныя словы ўдзячнасці — ветэранам працы, хто шчыравалі на гэтай ніве. Падмурак, закладзены вамі, — трывалая аснова для развіцця культуры сёння і ў будучыні.

Ад усяго сэрца жадаю усім калегам невычэрпнай энергіі, паспяховых праектаў і прызнання вашай працы. Няхай вашы праведныя справы, значны ўклад у развіццё грамадства і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны вяртаюцца да вас здароўем і дабрабытам. Няхай наша праца кожнаму прыносіць задавальненне і служыць крыніцай гонару за родную Беларусь!

Валянціна БАРАДЗІНЧЫК,
начальнік аддзела культуры
Іванаўскага райвыканкама

Паважаныя работнікі культуры, ветэраны галіны!

Прыміце самыя шчырыя віншаванні з прафесійным святам — Днём работнікаў культуры! Гэты дзень аб'ядноўвае ўсіх, хто працуе ў гэтай стваральнай сферы, аддаючы сябе высакароднай справе захавання і развіцця найбагацейшай спадчыны нашай зямлі.

Культура — гэта компас, які вызначае нашы каштоўнасці і захоўвае гістарычную памяць. Супрацоўнікі бібліятэк, школ мастацтваў, музеяў, спецыялісты дамоў культуры, калектывы мастацкай самадзейнасці — вы дапамагаеце зберагчы духоўныя каштоўнасці, створаныя чалавецтвам на працягу ўсёй гісторыі.

Добрасумленна выконваючы сваю працу, вы прыўносіце ў наша жыццё мастацтва і творчасць, гармонію і прыгажосць. Дзякуючы вашай працы і ідэям, памятныя і святочныя даты становяцца яркімі і запамінальнымі падзеямі для жыхароў і гасцей нашай любімай Беларусі.

Няхай вашае майстэрства, досвед і адданасць справе будуць і надалей служыць прымнажэнню лепшых культурных традыцый кожнага раёна і краіны ў цэлым.

Асаблівыя словы падзякі ветэранам галіны, якія аддалі шмат сіл развіццю культурнага жыцця нашага краю, дарылі людзям святы і добры настрой, перадавалі неацэнны вопыт і веды маладым спецыялістам.

Дарагія сябры! Прыміце шчырыя пажаданні моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення і творчай энергіі! Няхай пакараюцца новыя вяршыні і поўнасцю рэалізуецца ваш творчы патэнцыял!

Таццяна ГАЛІЦКАЯ,
дырэктар дзяржаўнай установы культуры
"Петрыкаўская сетка публічных бібліятэк"



Віншую ўсіх работнікаў культуры з прафесійным святам! Мы ўсе разам робім вялікую і вельмі патрэбную справу — падтрымліваем дух народа, дорым людзям эмоцыі і радасць. Дзякуючы культуры мы вучымся разумець сябе і адзін аднаго, адкрываць свет нанова. Жадаю, каб любімая праца прыносіла як мага больш пазітыўных пачуццяў, творчага імпэту і цікавых адкрыццяў. Няхай на вашым шляху заўсёды будуць адданыя людзі, шчырыя гледачы і слухачы, якія будуць натхняць на новыя творчыя перамогі!

Мікіта БЯЛЬКО,
суперфіналіст "X-Factor Беларусь", лаўрэат прэміі
"Песня года Беларусі" (2022, 2023)

Дарагія творцы прыгажосці і натхнення!

Сёння – ваш дзень, Дзень работнікаў культуры! Ад усяго сэрца віншуем вас ад імя нашага харэаграфічнага ансамбля!

Культура – гэта не проста словы і кнігі. Гэта рытм жыцця, мелодыя душы і бязмежны абшар фантазіі. Вы – сапраўдныя чараўнікі, якія ператвараюць штодзённасць у свята, а простыя моманты – у творы мастацтва.

Мы, танцоры, гаворым мовай цела, а вы сваёй творчасцю вучыце свет бачыць, чуць і адчуваць глыбей. Дзякуй вам за веру ў мастацтва, за стойкасць і натхненне. Няхай вашыя ідэі лунаюць у паветры, нібы лёгкі танец, а поспех заўсёды ідзе вам у пару!

Жадаем невычэрпнай энергіі, новых яркіх праектаў і творчых адкрыццяў! Няхай кожны дзень будзе напоўнены падзякай і прызнаннем, а сэрца – радасцю і любоўю да сваёй справы.

Працягвайце тварыць, натхняць і аб'ядноўваць усіх, бо культура жыве ў кожным з нас!

Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль "Харошкі"

Вы, дарагія работнікі культуры, неверагодна класныя! Ваша справа – гэта не проста праца, а высокае пакліканне. Дзякуючы вам гучыць музыка, ззяюць тэатральныя сцэны, адкрываюцца дзверы музеяў і бібліятэк, ажываюць народныя абрады і традыцыі. Дзякуй за вашу самаадданасць, крэатыўнасць і вернасць мастацтву!

Мой самы маштабны праект – фільм "Класная" – вынік неймаверных працы, таленту і руплівасці сотняў людзей. Ад усяго сэрца дзякую кожнаму: ад акцёраў і закадравых спецыялістаў да кансультантаў, якія дапамаглі стварыць па-сапраўднаму праўдзівае кіно. Мы разам праходзілі праз бяссонныя ночы, творчыя спрэчкі, складаныя здымачныя дні і моманты чыстага натхнення. І вось вынік – фільм, у якім жыве часцінка душы кожнага з нас. Вашыя намаганні ператварылі ідэю ў агульнанацыянальную прэм'еру! Гэта быў неверагодны шлях! Няхай энергія, якую вы ўклалі ў праект, вернецца да вас у сторазовым памеры. Няхай карціны, створаныя вамі, знойдуць водгук у сэрцах мільёнаў!

Са святам! З Днём работнікаў культуры Рэспублікі Беларусь!

Кірыл ХАЛЕЦКІ, рэжысёр Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм"



Дарагія работнікі культуры!

За пяць гадоў сваёй творчай дзейнасці я глыбока ўсвядоміла, якую магутную сілу мае культура і наша агульная праца. Вобраз "Матылька", які суправаджаў мяне падчас удзелу ў міжнародным конкурсе "Інтэрбачанне", стаў адлюстраваннем майго творчага шляху. Матылёк ляціць да святла, нягледзячы на перашкоды, і яго палёт становіцца магчымым толькі дзякуючы падтрымцы.

Вы – тыя, хто штодзень дорыць людзям сілу і натхненне. Вашы песні, спектаклі, кнігі, выставы робяць наш свет больш прыгожым і глыбокім. Дзякуючы вам захоўваюцца традыцыі і нараджаюцца новыя сэнсы, якія становяцца часткай нацыянальнай душы.

Няхай ваша творчасць, самаахвярная праца і шчырая адданасць справе працягваюць рабіць наш свет ярчэйшым, багацейшым і больш насычаным духоўна.

Жадаю нястомнага натхнення, яркіх творчых поспехаў і заслужанага прызнання вашых талентаў. Няхай кожны новы дзень прыносіць свежыя ідэі, цікавыя праекты і магчымасці для самавыяўлення. Няхай здароўе будзе моцным, а душа поўніцца радасцю і гармоніяй.

Дзякуй за ваш неацэнны ўнёсак у развіццё культуры, за тую цеплыню, якую вы дорыце людзям, і за тое, што робіце жыццё іншых прыгажэйшым і глыбейшым. Са святам!

Насця КРАЎЧАНКА, суперфіналістка "X-Factor Беларусь", лаўрэатка прэміі "Песня года Беларусі – 2024"

Зычу ўсім творцам плённай працы – і не толькі для сябе саміх, але і для агульнай карысці. Трэба заўжды памятаць, што кожны з нас з'яўляецца часткай вялікай творчай сям'і.

Іван МІСКО,
скульптар,
народны мастак
Беларусі

Ёсць людзі, чыя місія –
захоўваць бясцэннае, і работнікі культуры — з іх ліку.

Вялікі дзякуй за вашу працу, якая часта застаецца за кадрам, за кулісамі і ў цішыні майстэрняў. Дзякуй за бяссонныя ночы ў пошуках патрэбнай ноты, ідэальнага мазка ці дакладнай інтанацыі. Дзякуй за смеласць быць уразлівымі і дзяліцца са светам часткай сваёй душы.

Як чалавек, што прысвяціў сябе акцёрскай справе, ведаю напэўна: творчая прафесія — шлях, поўны сумневаў. І так важна сустрэць людзей, якія запаляць у табе святло веры ва ўласныя сілы. Вы, дарагія калегі, сталі гэтым святлом для мяне!

Ад усяго сэрца жадаю, каб духоўная рэальнасць, якую мы беражліва ствараем штодзень, заставалася такой жа чыстай, светлай і прыгожай. Няхай у ёй ніколі не знойдзецца месца для цемры і смутку, няхай яна напаўняецца толькі любоўю, мудрасцю і натхненнем.

З Днём работнікаў культуры Рэспублікі Беларусь!

Ірына МАРОЗ,
актрыса тэатра і кіно

Дарагія работнікі культуры!

Сёння мы адзначаем ваш неацэнны ўклад у развіццё грамадства, зберажэнне традыцый і ва ўзбагачэнне нашага жыцця мастацтвам. Дзякуючы вашаму таленту і самаадданасці свет вакол становіцца больш яркім і насычаным.

Вы — захавальнікі культурных каштоўнасцей, аўтары дзівосных твораў і натхняльнікі мноства людзей. Ваша праца патрабуе не толькі майстэрства, але і вялікай любові да справы. Вы дорыце радасць, прымушаеце задумвацца і перажываць самыя глыбокія пачуцці.

Са святам! Няхай ваша творчае ззянне ніколі не знікае, а кожны праект прыносіць задавальненне і поспех. Жадаем здароўя, шчасця і натхнення на новыя здзяйсненні!

Cosa Nostra (since 2010),
музычны калектыў, лаўрэат прэміі "Гурт года"
на "Песні года Беларусі — 2024"

▲ Вячаслаў СТАЎКЕВІЧ,
уладальнік медаля Францыска Скарыны,
мастацкі кіраўнік беларускага дзяржаўнага ансамбля
народнай музыкі "Свята"

Відэавіншаванне — у нашым Telegram-канале

▸ Уладзіслаў БАЕВІЧ, навучэнец Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі

Дарагія калегі!

Шчыра віншуем вас са святам! У культуру прыходзяць толькі па любові. Бо наша прафесія – гэта творчасць, праца на чыстым энтузіязме. "В мороз, жару и гололёд иди смелей вперёд, труба зовёт!" – спяваецца ў вядомай кампазіцыі. І мы ідзём. І дорым свята, эмоцыі, кранаем душу, бо інакш не можам. Жадаем вам нястомнага натхнення, цярпення, здароўя і сіл. Хто, калі не мы?

З любоўю – ваш "СМОЛТ".

Лёля СЯМЁНАВА,
мастацкі кіраўнік народнага тэатральнага калектыву "СМОЛТ"

• Аляксандр НАЛЯГАЧ, удзельнік Маладзежнага аркестра баяністаў і акардэаністаў, уладальнік прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі

Віншую з нашым прафесійным святам – Днём работнікаў культуры!

Часам у будзённым патоку можам забываць, якой асаблівай дзейнасцю займаемся. Але давайце на хвіліну спынімся і ўспомнім: мы з вамі – людзі дзіўнай прафесіі!

Мы дорым эмоцыі, якія прымушаюць сэрцы біцца часцей. Мы захоўваем гісторыю, каб будучыя пакаленні памяталі пра мінулае. Мы запальваем у душах святло надзеі і дапытлівасці. Мы надаём жыццю яркасці і асэнсаванасці. Наша праца – мазаіка, дзе кожны фрагмент мае значэнне, дапамагае стварыць агульную карціну культурнага і духоўнага багацця.

Няхай гэты ўклад, якім бы ён ні бачыўся – вялікім ці малым, заўсёды застаецца крыніцай гонару. Бо менавіта з нашых талентаў, сумесных намаганняў і веры нараджаецца тое, што натхняе, мяняе свет да лепшага і дорыць надзею.

Дзякуй за вашы дбайнасць і самаадданасць! Няхай праца будзе ў радасць, а ў штодзённасці заўжды знаходзіцца месца для цуду, гармоніі і прыгажосці!

Таццяна ПІОТУХ,
пераможца конкурсу "Малады лідар Міншчыны ў сферы культуры", настаўніца Барысаўскай дзіцячай музычнай школы мастацтваў

Афіша з 10 па 17 кастрычніка

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава беларускага шкла **"Васільковае трымценне". Да 10 кастрычніка.**
- Выстава **"Мой родны кут, як ты мне мілы!.."**, прысвечаная прыгажосці роднай зямлі ў творах беларускага пейзажнага жывапісу 2-й паловы XX – пачатку XXI стагоддзя з калекцыі музея. **Да 13 кастрычніка.**
- Камерная выстава **"Павел Южык (1874–1944). Мастак і настаўнік". Да 14 кастрычніка.**
- Міжнародны выставачны праект **"Сатар Бахлулзадэ: творца ўяўных сусветаў"** з калекцыі Азербайджанскага нацыянальнага музея мастацтваў. **Да 24 лістапада.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўнія мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск,
вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796,
8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Тэматычны дзень да Дня маці **"Сямейны выхадны ў музеі". 11 кастрычніка ў 14.00.**
- Выстава **"Дзеці. Радасць. Развіццё"** творчых работ мастацкай студыі Aqua-ART. **Да 29 кастрычніка.**
- Інтэлектуальна-забаўляльная гульня **"Прыгоды ў сядзібе". Праводзіцца заўсёды.**
- Праграма **"Кафляныя «люстэркі» шляхецкай сядзібы". Праводзіцца заўсёды.**
- Брэйн-рынг **"Эрудыцыя. Упэўненасць. Поспех". Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **"Таямніцы старажытнай сядзібы".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **"Пошукі мінулага". Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Сядзібны партрэт".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203,
8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава жывапісу Сяргея Масіхі **"Мой ты Сож, як мне люб і прыгож!..". Да 12 кастрычніка.**
- Выстава адной карціны – пейзажа Юлія Клевера **"Захад сонца". Да 2 лістапада.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Акаліца,
вул. Іванаўская, 176,
тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Батлеечны спектакль **"Цар Ірад". Кожную суботу і нядзелю ў 12.00.**
- Роспіс велікодных яек **"Пісанка". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Саломапляценне". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Лялька-мотанка". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Ткацтва". Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771